ЖР 3178 07/218
Бiблiятэка АН БССР

Камунистычная партыя (большэвикоу) Беларуси

# За Совецкую Радзиму

22 (41)
ЧАЦВЕР
4
МАЯ
1944 г.

Орган Уздзенскага РК КП(б)Б

**Смерць нямецким акупантам!**

Каб пазбавиць нашу краину и саюзныя з нами краины ад небяспеки прыгнёту трэба пераследаваць раненага нямецкага звера па пятах и дабиць яго у яго уласнай бярлозе.

(З Загада Вярхоунага Галоунакамандуючага Маршала Совецкага Саюза И. СТАЛИНА ад 1 Мая 1944 года).

# ЗАГАД

## ВЯРХОУНАГА ГАЛОУНАКАМАНДУЮЧАГА

**1 мая 1944 года. № 70. гор. Масква.**

Таварышы чырвонаармейцы и чырвонафлотцы, сержанты, афицэры и генэралы, партызаны и партызанки!

Працоуныя Совецкага Саюза!

Браты и сёстры, часова падпаушыя пад ига нямецких прыгнятальникау и гвалтоуна угнаныя на фашысцкую катаргу у Германию!

Ад имени Совецкага Урада и нашай большэвицкай Партыи витаю и виншую Вас з днем 1-га Мая!

Народы нашай краины сустракаюць дзень 1-га Мая у абстаноуцы выдающыхся поспехау Чырвонай Армии.

З часу разгрома нямецких дывизий пад Сталинградам Чырвоная Армия вядзе амаль непарыунае наступленне. За гэты час Чырвоная Армия прайшла з баями ад Волги да Серэта, ад прадгор'яу Кауказа да Карпат, знишчаючы варожую нечысць и вымятаючы яе з Совецкай зямли.

У ходзе зимовай кампании 1943-44 г. г. Чырвоная Армия выйграла гистарычную битву за Днепр и Правабярэжную Украину, сакрушыла магутныя абаронныя умацавання немцау пад Ленинградам и у Крыму, умелыми и имкливыми дзеяннями праадалела нямецкую абарону на водных рубяжох — Пауднёвы Буг, Днестр, Прут, Серэт. Амаль уся Украина, Малдавия, Крым, Ленинградская и Калининская абласци, значная частка Беларуси ачышчаны ад нямецких захопникау. Радзиме звернуты металургия Поудня, руда Крыварожжа, Керчы и Никапаля, пладародныя земли памиж Днястром и Прутам. З фашысцкага рабства вызвалены дзесятки мильёнау совецких людзей.

Выконваючы великую справу вызвалення роднай зямли ад фашысцких захопникау, Чырвоная Армия выйшла к нашым дзяржаўным границам з Румыняй и Чэхасловакияй и працягвае цяпер громиць варожыя войски на тэрыторыи Румынии.

Поспехи Чырвонай Армии стали магчымыми дзякуючы правильнай стратэгии и тактыцы совецкага камандавання, дзякуючы высокаму маральнаму духу и наступальнаму парыву нашых байцоу и камандзирау, дзякуючы добраму аснашчэнню нашых войск першакласнай совецкай ваеннай тэхникай, дзякуючы узросшаму искуству и вывучцы нашых артылерыстау, минамётчыкау, танкистау, лётчыкау, сувязистау, сапёрау, пехацинцау, кавалерыстау, разведчыкау.

Гэтыми поспехами у значнай меры садзейничали нашы великия саюзники — Злучаныя Штаты Америки и Вялікабрытания, якия трымаюць фронт у Италии супроць немцау и адцягваюць ад нас значную частку нямецких войск, забяспечваюць нас вельми цэнным стратэгичным сыр'ём и узбраеннем, падвяргаюць систэматычнай бамбардыроуцы ваенныя аб'екты Германии и падрываюць такимчынам ваенную магутнасць апошняй.

Але поспехи Чырвонай Армии маглi-б аказацца нетрывалыми, яны были-б зведзены на ништо пасля першага ж сур'ёзнага контрудара з боку працiуника, кали-б Чырвоную Армию не падпирали з тылу увесь наш совецки народ, уся наша краина. Чырвоная Армия у баях за Радзиму праявила бясприкладнае геройства. Але совецки народ не застауся у даугу перад Чырвонай Армияй. У цяжких умовах вайны совецки народ дабиуся рашаючых поспехау у справе масавай вытворчасци узбраення, агнеприпасау, абмундзиравання, харчавання и своечасовай дастауки их на франты Чырвонай Армии. За прайшоушы год сур'ёзна узрасла магутнасць совецкай прамысловасци. У строй уступили сотни новых заводау, шахт, дзесятки электрастанцый, чыгуначных линий, мастоу. Новыя мильёны совецких людзей стали к станкам, авалодали самыми складанымi прафесиями, зрабилися майстрами свайой справы. З чэсцю вытрымали испытании вайны нашы калгасы и соугасы. Непакладаючы рук, совецкае сялянства у цяжких умовах ваеннага часу працуе на палёх, забяспечваючы харчаваннем нашу армию и насельництва, пастауляючы сыр'ё нашай пра-

(Працяг на 2-й старонцы).

# Працяг Загада Вярхоунага Галоунакамандуючага

мысловасци. А наша интэлигенцыя абагацила совецкую навуку и тахнику, культуру и мастацтва новыми выдаюшчымися дасягненями и адкрыццями. Неацэнимыя заслуги у справе абароны Радзимы маюць совецкия жанчыны, самаадддана працуючыя у интарэсах фронта, мужна пераносячыя усе цяжкасци ваеннага часу, натхняючы на ратныя подвиги воинау Чырвонай Армии—вызвалицеляу нашай Радзимы. Айчынная вайна паказала, што совецки народ здолен тварыць цуды и выходзиць пераможцам з самых цяжких испытанняу. Рабочыя, калгасники, совецкая интэлигенцыя, увесь совецки народ перанепоунены рашучасци уского рыць разгром ворага, поунасцю аднавиць разрушаную фашыстами гаспадарку, зрабиць нашу краину яшчэ больш ,моцнай и заможнай.

Пад ударами Чырвонай Армии трашчыць и развальваецца блок фашысцких дзяржау. Страх и перапалох пануюць цяпер сярод румынских, венгерских, финских и балгарских „саюзникау" Гитлера. Зараз гэтыя гитлерауския спадручныя, краины яких акупираваны и акупируюцца немцами, не могуць не бачыць, што Германия прайграла вайну. У Румынии, Венгрыи, Финляндыи и Балгарыи ёсць тольки адна магчымасць пазбегнуць катастрофы: разрыу з немцами и выхад з вайны. Аднак, цяжка различваць на тое, што цаперашния урады гэтых краин здольны парваць з немцами. Трэба меркаваць, што народам гэтых краин прыдзецца самим узяць у свае руки справу свайго вызвалення ад нямецкага ига. И чым хутчэй народы гэтых краин зразумеюць, у яки тупик завяли их гитлерауцы, чым хутчэй спыняць яны усякую падтрымку свэих нямецких прыгняталь никау и их спадручных-квислингау у сваёй уласнай краине, тым менш ахвяр и разбурэнняу панясуць гэтыя краины ад вайны, тым больш яны могуць различваць на разуменне дэмакратычных краин.

У вынику паспяховага наступления, Чырвоная Армия вышла на нашы дзяржауныя границы на працягу больш 400 километрау, вызвалиуши ад нямецка-фашысцкага ига больш $^3/_4$ акупиравнай совецкай зямли. Справа цяпер заключаецца у тым, каб ачысциць ад фашысцких захопникау усю нашу зямлю и аднавиць дзяржауныя границы Совецкага Саюза па усей линии ад Чорнага мора да Барэнцава мора.

Але нашы задачы не могуць аграничвацца выгнаннем ворожых войск з прадзелау нашай Радзимы. Нямецкия войски напаминаюць цяпер раненага звера, яки прымушан адпаузаць к границам свэёй бярлоги—Германии для таго, каб залячыць раны. Але ранены звер, яки уцёк у сваю бярлогу, не перастане быць небяспечным зверам. Каб пазбавиць нашу краину и саюзныя з нами краины ад небяспеки прыгнету, трэба праследваць раненага нямецкага звера па пятах и дабиць яго у яго уласнай бярлозе. Праследуючы ж ворага, мы павинны вызвалиць з нямецкай няволи нашых братоу палякау, чэхаславакау и другия саюзныя з нами народы Заходняй Еуропы, якия знаходзяцца пад пятой гитлерауской Германии. Зразумела, што гэта задача прадстауляе больш цяжкую справу, чым выгнанне нямецких войск з прадзелау Совецкага Саюза. Яе можна рашыць тольки на аснове сумесных намаганняу Совецкага Саюза, Вяликабритании и Злучаных Штатау Пауночнай Америки, шляхам сумесных ударау: з Усходу—силами нашых войск и з Заходу—силами нашых саюзникау. Не можа быць сумнення, што тольки таки камбинираваны удар зможа поунасцю сакрушыць гитлераускую Германию.

Таварышы чырвонаармейцы, чырвонафлотцы, сержанты, афицэры и генералы! Партызаны и партызанки! Працоуныя Совецкага Саюза! Браты и сестры, часова падпаушыя пад ига нямецких прыгнятальникау и гвалтоуна угнаныя на фашысцкую катаргу у Германию! Витаю и виншую Вас з святам 1-га МАЯ!

**З А Г А Д В А Ю:**

У чэсць гистарычных перамог Чырвонай Армии на фронце и у азнаменаванне вяликих поспехау рабочых, калгаснккау, интэлигенцыи Совецкага Саюза у тылу, сёння, у дзень сусветнага свята працоуных, у 20 гадзин, зрабиць салют у Маскве, Ленинградзе, Гомели, Киеве, Харкаве, Растове, Тбилиси, Симферополи, Одэсе—двацццаццю артылерыйскими залпами.

**Няхай живе наша Совецкая Айчына!**

**Няхай живе наша Чырвоная Армия и Военна-Марски Флот!**

**Няхай живе Вялики Совецки народ!**

**Няхай живе дружба народау Совецкага Саюза!**

**Няхай живуць Совецкия партызаны и партызанки!**

**Вечная слава героям, паушым у баях за свабоду и незалежнасць нашай Радзимы!**

**Смерць нямецким захопникам!**

**Вярхоуны Галоунакамандуючы**
**Маршал Совецкага Саюза И. СТАЛИН.**

**Р Э Д К А Л Е Г И Я**